Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ГОЛАС СЕЛЯНІНА

ОРГАН СТАЎБЦОЎСКАГА РАЙКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ і РАЙВЫКАНКОМА

№ 34 Аўторак, 8 жніўня 1944 г.

Нашы войскі авалода[illegible]
там абароны немцаў [illegible]
## горадам і буйным чыгуначным в[illegible]
## САМБОР
і цэнтрам нафтавай прамысловасці Заходняй Украіны
## горадам БАРЫСЛАЎ

**Няхай жывуць совецкія воіны — гэраічныя сыны вялікай соцыялістычнай Радзімы!**

## АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

### З аператыўнай зводкі за 7 жніўня

На працягу 7 жніўня паўночна-заходней горада РЭЗЭКНЭ (Рэжыца) нашы войскі, працягваючы весці наступальныя баі, авалодалі горадам ЛУБАНА і з баямі занялі некалькі населеных пунктаў. Нашы войскі перарэзалі чыгуначны шлях і шашу ЛУБАНА-МАДОНА.

Заходней і паўднёва-заходней горада ШАЎЛЯЙ нашы войскі з баямі прасоўваліся наперад і авалодалі буйнымі вузламі грунтовых дарог КУРШЭНАЙ і ШАЎКЯНЫ, а таксама з баямі занялі больш 50 другіх населеных пунктаў.

Паўночна-заходней горада КАЎНАС (Ковно) нашы войскі, зламаўшы супраціўленне праціўніка, занялі больш 40 населеных пунктаў.

Паўночна-заходней і паўднёва-заходней горада БЕЛАСТОК нашы войскі, зламаўшы супраціўленне праціўніка, авалодалі гарадамі КНЫШЫН, ЛАПЫ.

Заходней горада САНДОМІР нашы войскі вялі паспяховыя баі па расшырэнню плацдарма на левым беразе ракі ВІСЛА і занялі больш 60 населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты СОСНІЧАНЫ, КЛІМОНТУЎ, КОНАРЫ, БОГОРЫЯ, ШЫДЛАЎ, ПШУБАРУЎ і чыгуначную станцыю БОГОРЫЯ.

Войскі 1-га УКРАІНСКАГА фронта, у рэзультаце ўпорлівых баёў, 7-га жніўня штурмам авалодалі важным апорным пунктам абароны немцаў у прадгор'ях Карпат — горадам і буйным чыгуначным вузлом САМБОР.

Войскі 4-га УКРАІНСКАГА фронта, працягваючы наступленне 6 жніўня авалодалі буйным цэнтрам нафтаздабываючай прамысловасці Заходняй Украіны — горадам БАРЫСЛАЎ.

На другіх участках фронта — без істотных змен.

За 7 жніўня нашы войскі на ўсіх франтах падбілі і знішчылі 110 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 116 самалётаў праціўніка.

## Англійскія войскі ўступілі ў Фларэнцыю

Войскі саюзнікаў фарсіравалі раку Эма, авалодалі вузламі супраціўлення праціўніка ў Галлуццо на беразе ракі Цесна падышлі да прадмесцяў Фларэнцыі.

Далей на захад часці індыйскай дывізіі прасунуліся на поўнач ад свайго плацдарма на правым беразе ракі Пеза і зараз знаходзяцца ў кілометры ад горада Сінья.

Усходней Фларэнцыі часці адной англійскай дывізіі захапілі Бавво а Рыполі (у трох мілях ад Фларэнцыі) і знаходзяцца ў кілометры ад ракі Арно паўночней гэтага горада. Іншыя англійскія часці, прасоўваючыся да Поктасіеве (у 10 мілях да ўсходу ад Фларэнцыі), занялі пункт Рыньяно (у 5 мілях паўднёвей Понтасіеве).

Паўднёва-афрыканскія часці англійскай 8-ай арміі ўступілі ў цэнтральную частку горада Фларэнцыі.

## Выступленне Чэрчылля ў англійскім парламенце

2-га жніўня англійскі прэм'ер-міністр Чэрчылль выступіў перад англійскім парламентам з аглядам ваеннага палажэння.

Пасля таго, як Чэрчылль асвяціў палажэнне на Ціхім акіяне, у Бірме, у Францыі і Італіі ён сказаў:

„Я павінен сказаць, датыкаючыся гэтых розных кампаній ва ўсім свеце, што я не казаў аб адным важным удзельніку да гэтага моманту, а іменна аб рускай арміі, якая адыграла галоўную ролю і выматвае кішкі з германскай арміі. (АПЛАДЫСМЕНТЫ). У паветры, на акіяне і на моры мы можам зберагчы нашае палажэнне, але не было ў свеце такой сілы, хіба што яна была бы створана праз некалькі год, якая магла бы сакрушыць германскую армію і нанесці ёй такіяаграмаднейшыя страты, як гэта зрабілі рускія совецкія арміі. Я вітаю маршала СТАЛІНА (АПЛАДЫСМЕНТЫ), гэтага вялікага правадыра сваёй краіны, і я ўпэўнен у тым, што наш дваццацігадовы дагавор з Расіяй з'явіцца адным з найбольш доўгіх і прочных фактараў у справе захавання пакоя, парадка і прагрэса ў Еўропе. Упаўне можа аказацца, што поспехам рускіх у якой-та меры садзейнічала стратэгія ефрэйтара Гітлера. Нават безмозгія вайсковыя не могуць не бачыць некаторых недахопаў некаторых яго дзеянняў. Наогул я думаю, што афіцэрам лепш за ўсё падымацца па службовай лесвіцы ўзаконеным парадкам".

# Дадзім фронту і краіне больш прадуктаў харчавання

## Сяляне вёскі Сверэнава — першыя

Першымі прывезлі на скупачны пункт 1230 кг. жыта, закупленае дзяржаўнымі закупачнымі органамі, сяляне вёскі Сверэнава, Задворынскага сельсовета.

За іх прыкладам працоўныя сяляне ўсіх вёсак нашага раёна выконваюць свой грамадзянскі абавязак і своечасова прывязуць на вызначаныя пункты закупленае дзяржавай зярно.

## За адзін дзень

За 6-ае жніўня на нарыхтовачныя пункты ў Стоўбцах завезлі зярно закупленае дзяржавай:

Сяляне Гавізненскага сельсовета—806 клг. жыта.

Варацішчанскага сельсовета —419 клг. жыта, 201 клг. грэчыхі і 65 клг. ячменя.

Зэсульскага сельсовета — 137 клг. жыта.

Залужскага сельсовета—116 клг. жыта.

Мікалаеўскага сельсовета— 56 клг. жыта.

## Да ведама сялян Стаўбцоўскага раёна, вязучых пастаўкі дзяржаве

Чырвоныя абозы і паасобныя сялянскія фурманкі павінны накіроўвацца:

З жытам і ячменем — да прыёмнага пункта каля мельніцы былой Кітаевіча.

З аўсом і іншымі—да прыёмнага пункта № 2, каля чыгуначнай станцыі.

## Па прыкладу жанчын з Мікалаеўшчыны

Каля будынку сельскага совета ў Мікалаеўшчыне сёння надзвычай рухліва. Жанчыны з сярпамі адна за другой падыходзяць сюды, ажыўлена гутараць адна з другой з жарам.

— Я сваё ужо зжала,—кажа Зося Дзямешка.

—Калі толькі жыта паспела я кожны дзень з ранкою ад ўсхода сонца была на полі, старалася сабраць усё своечасова, каб ні адно зярнятка не прапала. Сёлета смела мы жалі і вазілі ў гумны, няма каго баяцца, не палярцаць-жа нямецкія крумкачы, каб паліць і браць наш пажытак.

— І я ўжо скончыла, не гледзячы на тое, што мужык у рады Чырвонай Арміі пашоў, кажа Міцкевіч Вольга,—суседкі, вось дзякуй ім, памаглі.

— Да і ўсе мы ўжо сваё пакончалі, — кажа старая партызана Міцкевіч Анна—а цяпер вось пойдзем і дзяржаўнае сажнём. Паспяшаймася, дык хутка нашы вызваліцелі пакаштуюць новага хлеба з беларускай зямлі.

Жанчыны накіроўваюцца ў вёску Грабёнаўшчына, дзе іх чакаюць поўныя каласы, якім надаела ужо слухаць шум ветру, якім ужо хочацца адпачыць у снапках.

Праз некаторы час грамада жанчын заўзята працуе. Чуваць толькі звон сярпоў, шорах спелай саломы, якую шпаркія рукі скручваюць у перавяслы.

Час ад часу чуваць кароткія словы: „Ох, як горача, дайце вады." І далей ціха, толькі шорах і звон. Жыта імгненна знікае. На яго месца паяўляюцца цяжкія снапы.

Е. С.

## Завод адбудоўваецца

Фашысцкія падпальшчыкі перад адступленнем замінавалі Нова-Свержанскі лесазавод і ўзарвалі яго.

Калектыў рабочых прышоў на завод як да разбітага карыта. Відаць было толькі абгарэўшыя агрэгаты і груды абгарэўшага цэменту. Рабочыя духам не падалі, ведаючы, што ў іх ёсць галоўнае: свая родная совецкая ўлада.

Напорыста прыступілі яны да ачысткі тэрыторыі завода і да разборкі абгарэлых агрэгатаў. Пры разборцы аказалася, што маецца толькі адзін локамабіль, які можна паставіць на работу, правёўшы капітальны рамонт.

На працягу 3 тыдняў рабочыя паспелі: выправіць выцяжныя трубы, разабраць 4 лесапільных рамы, разабраць локамабіль, залажыць асноўныя карпусы, устанавіць кузніцу на 2 горны, устанавіць сваі пад палы, правесці рамонт жылых памяшканняў, сталовай, кухні і шэрагу другіх устанаўліваючых работ.

З вялікім энтузіязмам рабочыя ўзяліся за работу. Асабліва адзначылася брыгада слесароў у колькасці 18 чалавек пад кіраўніцтвам брыгадзіра т. Маляўка і брыгада плотнікаў у колькасці 12 чалавек пад кіраўніцтвам брыгадзіра т. Безпразваннага.

Мы ўпэўнены, што завод будзе ў хуткім часе адбудаван.

СВЕТЛЯК.

## Школы для нашых дзяцей

Пасля трохлетняга змушанага перапынку для нашых дзяцей зноў адчыняцца дзверы роднай совецкай школы.

У Стаўбцоўскім раёне да новага школьнага года будуць адчынены 59 школ з іх 7 няпоўна-сярэдніх, астатнія пачатковыя.

У 42 школах ужо назначаны дырэктары, якія прыступілі да ўліку дзяцей школьнага веку, да рамонту школьных памяшканняў, да збору школьнай маёмасці і г. д.

Адказны рэдактар Г. Д. СМОЛЯР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: г. Стоўбцы, вуліца Соцыялістычная, дом № 69.